■ Выстава

# ДЗЕНЬ З ЖЫЦЦЯ ТАЛЕНТА

**У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» пачала працаваць фотавыстаўка «Валянцін Елізар'еў. Рэпартаж з цяперашняга часу».**

Сёлета народны артыст СССР Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ адзначае юбілей. Уладальніку найпрэстыжнейшай балетнай прэміі Benois de la Danse ад міжнароднай асацыяцыі танца, ордэна Францыска Скарыны, ордэна Айчыны III і II ступені, медаля ЮНЕСКА "Пяць кантынентаў" ды мноства іншых ганаровых адзнак спаўняецца 70 гадоў. Напярэдадні юбілею вядомы балетмайстар атрымаў незвычайны падарунак: фотавыстаўку-прысвячэнне ад маладога фатографа Мікіты Фядосіка.

— Выстаўка адметная тым, што тут няма ніводнага пастановачнага кадра, — кажа Валянцін Елізар'еў. — Усе фотаздымкі рэпартажныя: сюжэт нараджаецца і фіксуецца за адну секунду. Гэта — жыццё і творчасць, прыпыненыя на імгненне.

Пасля сыходу з Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі ён працягвае працаваць на карысць балета, але ўжо ў якасці педагога. Сёння Валянцін Мікалаевіч — прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Студэнты, што вучыліся ў майстра, часта становяцца лаўрэатамі прэстыжных міжнародных конкурсаў. Педагагічная дзейнасць Елізар'ева — таксама мастацтва, якое заслугоўвае выхад да аўдыторыі. Сямнаццацігадовы фатограф Мікіта Фядосік прызнаецца, што задумы зрабіць выстаўку адразу не было: хацелася навучыцца чамусьці новаму, убачыць славутага балетмайстра за работай.

— Творчасцю Валянціна Елізар'ева цікаўлюся даўно: бачыў усе яго балеты, заўсёды марыў пазнаёміцца з творцам і паздымаць балет, — расказаў Мікіта Фядосік. — Калі я даведаўся, што цяпер ён прафесар акадэміі музыкі, папрасіў Валянціна Мікалаевіча папрысутнічаць на яго занятках. Неякім цудам ён пагадзіўся. З цягам часу я зразумеў, што здымаць трэба не балет, а самога балетмайстра.





Вынік сустрэчы з майстрам — 54 «жывыя» фотаздымкі, змешчаныя ў чатырох памяшканнях галерэі «Універсітэт культуры». На іх адбітак штодзённага жыцця Елізар'ева: балетная студыя, вучні, развагі і, галоўнае, імкненне перадаць маладым вопыт і эстэтыку танца разам з любоўю да балета. Валянцін Елізар'еў упершыню апынуўся перад аб'ектывам фотакамеры ў якасці настаўніка і вельмі задаволены ажыццёўленым праектам.

— Я пагадзіўся на здымкі, бо малады чалавек мне спадабаўся. У першыя дні ён крыху бянтэжыў сваёй прысутнасцю, але пасля я прызвычаіўся і перастаў звяртаць на яго ўвагу. Цяпер, калі здымкі скончыліся, нават нечага не хапае, — кажа Валянцін Елізар'еў.

На працягу 35 гадоў творца займаў высокія пасады ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі. Валянцін Елізар'еў паставіў шмат балетаў у Мінску, супрацоўнічаў з тэатрамі Еўропы, Кітая, Японіі, краін Блізкага Усходу. «Кармэн-сюіта», «Балеро», «Стварэнне свету», «Спартак», «Тыль Уленшпігель», «Шчаўкунок», «Страсці» («Рагнеда»), «Карміна Бурана», «Вясна святая», «Дон Кіхот», «Жар-птушка», «Рамэа і Джульета» ды іншыя пастаноўкі трапілі ў пералік яго дасягненняў. Арганізатары выстаўкі не маглі не згадаць бліскучы творчы шлях Валянціна Елізар'ева: на вернісажы змешчаны афішы да спектакляў балетмайстра з архіва Дзяржаўнага музея тэатральнай і музычнай культуры Беларусі і асабістай калекцыі артыста.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ З нагоды

# Перайшлі экватар

Музычна-адукацыйны праект «Беларусь-тур» падводзіць прамежкавыя вынікі

**Верасень мінулага года стаў не толькі пачаткам школьных заняткаў, але і стартам дабрачынных канцэртаў і майстар-класаў для вучняў музычных школ па ўсёй Беларусі. За плячыма калектыву «Беларусь-тур» засталася ўжо палова краіны: з запланаваных 120 гарадоў выступленні прайшлі больш як у 60 населеных пунктах.**

Ініцыятыва «Беларусь-тур» скіравана на папулярызацыю беларускага музычнага мастацтва. У межах праекта **лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі, кампазітар, спявак, акардэаніст Ігар КВАШЭВІЧ** сустракаецца з вучнямі мастацкіх ды музычных школ на ўсіх раёнах краіны. Акрамя заняткаў з таленавітымі дзецьмі, залаты акардэон Беларусі праводзіць эстрадныя канцэрты ў мясцовых дамах культуры для ўсіх аматараў музычнага мастацтва. Вынікам гадавога тура стане фінальны гала-канцэрт у Мінску, у якім на аднолькавых правах з дарослымі выканаўцамі возьмуць удзел маладыя таленты. Праект «Беларусь-тур» ажыццявілі з дапамогай Міністэрства культуры і грамадскай арганізацыі «Белая Русь».

— Міністэрства культуры далучылася да праекта «Беларусь-тур»: дапамагала ў асвятленні цыкла мерапрыемстваў, дасылала афіцыйныя лісты ў падтрымку ініцыятывы, — кажа **галоўны спецыяліст упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Беларусі Іна МАРДУСЕВІЧ**. — Пасля выступленняў Ігара Квашэвіча ў захапленні былі не толькі дзеці, але і іх бацькі, педагогі. Зараз мы атрымліваем шмат лістоў з падзякамі ад дырэктараў музычных школ на імя міністра культуры Барыса Святлова.

Ініцыятар праекта Ігар Квашэвіч падзяліўся з журналістамі ўражаннямі ад паўгадавога музычнага падарожжа па беларускіх гарадах. Па словах акардэаніста-віртуоза, найбольшым адкрыццём праекта стала запатрабаванасць ініцыятывы, а таксама вялікая колькасць здольных дзяцей. Вызначыць самых лепшых надзвычай складана: праект яшчэ толькі «перайшоў экватар», пазнаёміўся з паловай канкурсантаў, а ўжо пабачыў шмат годных кандыдатаў на ўдзел у фінальным гала-канцэрце.

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**

■ Нотны радок

# «ВЯСНОВЫЯ» ПРАСВЯТЛЕННІ

**«Мінская вясна» сёлета ўключае ў сябе 16 канцэртаў у залах Беларускай дзяржаўнай філармоніі, аб'ядноўвае музыкантаў з шасці краін свету і прадстаўляе камерную, сімфанічную, вакальную, харавую і джазавую музыку. Канцэрты розныя па жанрах, але агульнае для іх тое, што разам з вядомымі прозвішчамі тут гучаць новыя імёны маладых музыкантаў, пра што расказаў мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі Юрый ГІЛЬДЗЮК.**

Прынамсі, пад знакам маладых пройдуць тры канцэрты, прысвечаныя 100-годдзю выдатнай выкладчыцы і піяністкі І. А. Цвятаевай. Прафесар доўгі час працавала ў кансерваторыі, вырасціла каля 25 лаўрэатаў міжнародных конкурсаў, калі такой колькасці конкурсаў нават не было. Сярод яе вучняў — І. Алоўнікаў, С. Мікулік, І. Семяняка і тыя, хто цяпер ужо сам вучыць музыкантаў...

З той жа катэгорыі канцэрт да 70-годдзя з дня нараджэння Тацціяны Сергіенкі, якая шмат зрабіла для развіцця беларускай цымбальнай школы. З неймавернай музыкай мандаліны таксама пазнаёмяць маладыя беларускія музыканты: падчас фестывалю адбудуцца міжнародныя дні мандалінна-гітарнай музыкі. Наш канцэрт будзе шматгранным — на адной сцэне збяруцца віртуозы з Беларусі і Францыі.

Сёлета ўпершыню на беларускай сцэне выступіць Джэ Юэн з Кітая, выканае творы Шапэна, Шумана і Лігеці. Яшчэ адзін з замежных гасцей, якіх доўга чакала беларуская публіка, — віяланчэліст з Вялікабрытаніі Нікалас Джонс.

Важным складальнікам «Мінскай вясны» будуць выступленні айчынных музыкантаў, асабліва маладых, і нават калі яны жывуць у іншых краінах, то прадстаўляюць сваёй музыкай Беларусь і вяртаюцца дадому, каб даваць канцэрты. Піяніст Віталь Стахіевіч, які цяпер жыве і працуе ў Нідэрландах, выканае творы Шапэна, Ліста, Скарлаці, Пракоф'ева і Вайніцкага ў апошні вечар «Мінскай вясны». Але самым прыемным падарункам стане выступленне маладых віртуозаў Беларусі — піяністкі Кацярыны Давыдавай і віяланчэліста Мікаэла Самсонава, вучня Уладзіміра Перліна, які атрымаў музычную прэмію ў Вашынгтоне.

Самы незвычайны канцэрт у праграме — «Тэрменвокс?.. Тэрменвокс!». Інструмент — гэта насамрэч радыёхвалі, якія даюць незвычайны гук. У 1920 годзе тэрменвокс вынайшаў Леў Тэрмен для вымярэння фізічных велічынь, але са свету фізікі інструмент перайшоў у свет музычны. Тэрменвокс прагучыць падчас аднаго з вечароў з камерным аркестрам Рэспублікі Беларусь.

Іншыя вымярэнні адкрыюцца і падчас канцэртаў Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі. Паводле слоў дырыжора і мастацкага кіраўніка калектыву Аляксандра Анісімава, адзін канцэрт прысвечаны маладым і таленавітым беларускім музыкантам. Асобная праграма працягвае тэму Вялікага посту: прагучаць вядомы «Рэквіем» Моцарта і менш папулярная, але неймаверна прыгожая, па словах Анісімава, сімфанічная паэма Рыхарда Штрауса «Смерць і прасвятленне».

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**

■ Фестываль

# Cinema Perpetuum Mobile сёння пакажа беларускае кіно




**Адна з найцікавейшых кінападзей праходзіць цяпер у Мінску — штогадовы міжнародны кінафестываль кароткаметражнага кіно Cinema Perpetuum Mobile 5 красавіка распачаў свае паказы ў Культурным цэнтры «Корпус». Анімацыйнае, дакументальнае кіно, эксперыментальныя праграмы, балтыйскі дзень, майстар-клас — нарэшце сёння арганізатары плануюць паказаць беларускую конкурсную праграму, якую назвалі «Іронія і праўда», і так званы Belaruski No Wave.**

> **У праграмы беларускіх кароткаметражак увайшло некалькі работ найцікавейшых сучасных беларускіх фатографаў.**

Кінафестываль, што праходзіць ужо шосты раз, трымаецца на энтузіязме аматараў кіно і арганізуецца як некамерцыйнае мерапрыемства, на шчасце, заняў трывалую і працяглую ў часе нішу беларускага, калі можна так сказаць, фестывальнага руху. Дарэчы, ён не адзіны даказвае жывучасць ініцыятыў, створаных без удзелу дзяржаўных інстытуцый: у сістэму ўпісваюцца, напрыклад, фестываль беларускага кіно «Бульбамуві» альбо фестываль кіно скандынаўскіх краін «Паўночнае ззянне», які, дарэчы, абяцае адбыцца ўжо ў гэтым месяцы.

У структуры Cinema Perpetuum Mobile ўваходзяць асобныя праграмы беларускага кіно, адна з якіх — конкурсная. Сёлета журы будзе ацэньваць восем работ. Некаторыя з кароткаметражак уперад былі паказаныя ў праграме «Бульбамуві» — напрыклад, «Адамаў яблык» Алены Ясінскай з невядомага альманаха «Хранатоп» (кожная «акцыя» якога праводзіцца пад куратарствам Андрэя Кудзіненкі) ці дакументальны фільм «Музыка пад Брайлем» Вольгі Пятровай пра сляпога хлопчыка-спевака.

> **Аб выніках конкурсаў мы даведаемся ўжо заўтра — на 9 красавіка прызначана закрыццё фестывалю.**

Знамянальна, што ў праграмы беларускіх кароткаметражак увайшло некалькі работ найцікавейшых сучасных беларускіх фатографаў (гэта з'ява не новая) — Сяргея Гудзіліна, Аляксандра Васюковіча, Максіма Сарычава. Усе тры аўтары ўключаны ў праграму Belaruski No Wave, якая збірае работы, што сумяшчаюць у сабе «сродкі выразнасці «старога» кінематографа, відэаблогаў, фатаграфіі, інтэрнэт-серыялаў, арт-перфомансаў і відэаарта». І ўсё ж гэта кіно — не ў класічным разуменні вялікай індустрыі, а ў больш глыбокім, калі фільмам з'яўляецца «фатаграфія, што рухаецца», то-бок сам цуд руху, жыцця на экране, з якога аўтары пачынаюць свае пошукі сродкаў выказвання.

Сёння ж пройдзе майстар-клас па анімацыі для дзяцей, будзе паказана яшчэ адна анімацыйная праграма (для дзяцей ад сямі гадоў), паказы «Балтыйскага дня» і конкурсная ігравая праграма. Аб выніках конкурсаў мы даведаемся ўжо заўтра — на 9 красавіка прызначана закрыццё фестывалю. А больш дэталёвы разбор беларускага кіно, якое мы ўбачым на Cinema Perpetuum Mobile, будзе апублікаваны пазней.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*